Працуючы над харавым творам, неабходна знаёміцца з творчасцю кампазітара, сальфеджыраваць галасы.

У працэсе работы над харавымі партыямі педагог накіроўвае слыхавую ўвагу студэнта на свядомае інтанаванне партый, сочыць за яго дыханием, артыкуляцыяй, якасцю гука. Такім чынам адбываецца ўзаемасувязь з сальфеджыо і вакалам. У работу над партытурай уваходзіць вакальна-харавы, гарманічны і структурны аналіз твора. У гэтай сувязі асаблівае значэнне маюць курсы гармоніі, сальфеджыо, аналізу форм, хоразнаўства.

Сістэма арганізацыйных форм і метадаў навучання, якая выкарыстоўваецца ў класе дырыжыравання, павінна быць накіравана на фарміраванне і развіццё музычна-педагагічных здольнасцей студэнтаў, іх самастойнасці і гатоўнасці да выкладчыцкай дзейнасці.

З першых курсаў у працэсе навучання неабходна ствараць умовы для самастойнай работы студэнтаў. Адным са сродкаў, якія стымулююць творчае мысленне, з'яўляюцца пісьмовыя аналізы твораў, што вывучаюцца ў класе.

Мэтай вучэбнага працэсу павінна быць не толькі засваенне ведаў, але і ўменне выкарыстаць гэтыя веды ў практычнай дзейнасці.

У кожнай вучэбнай дысцыпліне неабходна вызначыць не толькі аб'ём тэарэтычных ведаў, але і практычныя навыкі. Менавіта яны фарміруюць прафесійныя навыкі, самастойнасць мыслення.

Міжпрадметныя сувязі як сістэма адносін паміж ведамі, уменнямі і навыкамі павінны забяспечыць актывізацыю самастойнай работы студэнтаў, якая з'яўляецца вядучым відам іх дзейнасці ў ВНУ. Вельмі важным вынікам умення студэнтаў працаваць самастойна з'яўляецца павышэнне іх матывацыі ў авалоданні прафесіяй.

Жураў А.В.,
дацэнт

## ЗНАЧЭННЕ АЎФТАКТА Ў ХАРАВЫМ МАСТАЦТВЕ

Са з'явай аўфтакта нам часта даводзіцца сустракацца ў сваёй штодзённай працоўнай дзейнасці. Прызвычаіўшыся да яго, мы нават не заўважаем і не вылучаем яго з агульнага працэсу. Так, напрыклад, каб кінуць на нейкую адлегласць прадмет, мы спачатку павінны замахнуцца. Ад сілы замаху будзе залежыць хуткасць руху і далёкасць палёту прадмета. Тут мы робім фізічнае намаганне "замах", які і будзе нічым іншым, як аўфтактам.

Пры неабходнасці зрабіць сумеснае, групавое фізічнае намаганне звычайна кажуць: "Раз...два...узялі!" Аўфтактам тут з'яўляецца "два", а "раз" — падрыхтоўкай да яго.

Часта пры рабоце ў музычных калектывах мастацкай самадзейнасці кіраўнік карыстаецца гукавым сігналам "і" ці "два", які з'яўляецца ў данным выпадку аўфтактам, прадвесцем будучых калектыўных дзеянняў. Такім жа гукавым сігналам з'яўляецца і адстукванне дырыжорам лікавых долей нагой ці рукой, вымаўленне ліку ўслых. Усе гэтыя сігналы з'яўляюцца прадвеснікамі будучых дзеянняў калектыву выканаўцаў.

У працэсе дырыжыравання замест гукавых пабуджальных сігналаў ужываюцца зрокавыя, заснаваныя на ўспрыманні фізічных дзеянняў, у дадзеным выпадку рухаў рук. Гэтыя пабуджальныя сігналы, заключаныя ў жэсце, заўсёды павінны выконвацца строга ў часе, які адпавядае тэмпу твора ці асобных яго частак, музычных фраз і г.д. Жэст, які нясе ў сабе пабуджальныя сігналы да дзеяння і зроблены строга ў неабходным часе з зададзенай мэтай, з'яўляецца аўфтактам.

Паколькі аўфтакт заўсёды накіраваны на падрыхтоўку будучага гучання, функцыя прадвяшчання выяўляецца ў ім з асаблівай вастрынёй і канцэнтраванасцю. Таму, натуральна, у яго аснове і будзе заўсёды паскораны рух, які адрозніваецца спецыфічнай пабуджальнасцю, імпульсіўнасцю. Гэты рух і адрознівае яго (аўфтакт) ад іншых дырыжорскіх рухаў, ён называецца імпульсам.

Імпульс у аўфтакце канцэнтруе ўвагу выканаўцаў і дае загад, штуршок да дзеяння. Імпульсіўнасць паскоранаму руху ў аўфтакце надаюць дзве акалічнасці. Па-першае, ён мае рэзкі характар за кошт пунктаў, што яго абмяжоўваюць. Па-другое, паскораны рух у аўфтакце займае мінімальна магчымы час, што прымушае выканаўцаў кантраляваць увагу. За кошт сціскання часу і акцэнтавання пунктаў рух набывае характар актыўнага паскарэння да "мэты" і таму эфектыўна выконвае функцыю прадвяшчання.

Аднак трэба адзначыць, што не заўсёды пасля імпульсу рух угару або ўніз можа паскарацца. Усё залежыць ад характару твора, яго тэмпаў, дынамікі і інш.




1. Пачатак ауфтакта (імпульсу).
2. Прыкладныя межы імпульсу.
3. Прыкладныя межы паскарэння, запавольвання або раўнамернага руху.
4. Уступ.

Узыходзячы рух, насуперак дзеянню закону прыцяжэння, можа аказацца паскораным, а сыходны -- запаволеным. У асноўным жа працэс дырыжыравання абапіраецца на дзеянне закону прыцяжэння, на ўласцівасць цела запавольваць рух пры кідку ўгару і паскараць рух пры свабодным падзенні. Напрыклад, калі дырыжор падымае руку ўгару, яна звычайна запавольвае свой рух, як і іншы падкінуты ўгару прадмет. Калі рука з верхняга пункта падае ўніз, яна, як і іншае падаючае цела, паскарае свой рух.

У залежнасці ад характару музыкі і ад тэмпу імпульс можа быць больш "вострым" або больш "мяккім", гэта значыць, то змяншацца, то павялічвацца ў часе.

Імпульс з'яўляецца вызначальнай уласцівасцю ауфтакта, як бы яго "ядром". Без такога "ядра" ауфтакт немагчымы, і ў той жа час наяўнасць імпульсу надае любому гучанню функцыю ауфтакта.

Будучы звязаным у часе з дадзеным гучаннем, па прызначэнні сваім гэты паскораны рух (імпульс) належыць будучаму гучанню. Так, напрыклад, можна назіраць, як дырыжор на фоне гучання піяна робіць жэст, які адпавядае гучанню фортэ ці наадварот, гэта значыць, не дадзенаму, а будучаму гучанню. Тое ж самае адбываецца пры паказе новага тэмпу, штрыха, рытму і інш., усяго таго, што забяспечвае ауфтакт.

Ауфтакт -- гэта жэст, які і "тут", і "наперадзе". І чым больш ён адлюстроўвае гучанне, якое адбудзецца, тым больш ён эфектыўны.

Міхалькова Л.К.,
ст.выкладчык

## ПЕСЕННЫЯ ЖАНРЫ Ў КУРСЕ ПРАДМЕТА "СУЧАСНАЯ ХАРАВАЯ ЛІТАРАТУРА"

Сучасная харавая літаратура ў цяперашні час патрабуе звароту да традыцый і спадчыны мінулага.

Спеўнасць -- спрадвечная ўласцівасць харавога стылю. У харавой музыцы апошніх гадоў спеўнасць развіваецца ў формах, звязаных з актывізацыяй жанравых прымет канта і харавога канцэрта.

У прадкласічны перыяд канца XVII--пач.XVIII стагоддзя разнавіднасці канта былі вельмі шматлікімі (духоўныя, любоўныя, віватныя і іншыя). На раннім этапе ў іх кола ўваходзілі таксама псалмы -- песні рэлігійнага зместу. Кант адлюстроўвае характэрныя асаблівасці народнапесеннай творчасці, ён увабраў тыповыя інтанацыі і рытмічныя рысы некаторых фальклорных жанраў.

Пазней асаблівасці канта як песеннага жанру аказалі ўплыў на стылістыку хароў рускай класічнай оперы, ансамблевых оперных сцэн. Кант даў жыццё бытавому рамансу і песні, спрыяў развіццю канцэртнай харавой лірыкі.

Другім найважнейшым вакальным жанрам прадкласічнага часу рускага мастацтва з'яўляецца харавы канцэрт. Яго асаблівасці таксама ўплываюць на далейшае развіццё айчыннай харавой музыкі. У многіх адносінах харавы канцэрт быў блізкі канту, напрыклад у такіх жанравых разнавіднасцях, як віватны, а таксама звязаных з абрадам пахавання.

"Кантавасць" і "канцэртнасць" ярка выявіліся ў харавой лірыцы Г.Свірыдава, які творча пераасэнсаваў традыцыйныя рысы канта і харавога канцэрта, асобных прыёмаў знаменнага распеву. Выклікана гэта галоўнай тэмай творчасці Свірыдава, яна прысвечана "духоўнаму жыццю рускага народа".

Зварот да жанру харавога канцэрта садзейнічае пашырэнню тэмбрафанічных магчымасцей харавой музыкі -- старажытных вакальных асноў, якія выходзяць з традыцый рускай пеўчай культуры.

Канцэрт для хору ў цяперашнім значэнні гэтага слова -- паняцце далёка не адназначнае. У сувязі з гэтым мэтазгодна ўвядзенне паняцця

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ